Каралёў М.

# ІШЛІ НОЧЧУ ПАРТЫЗАНЫ

Было гэта восенню 1941 года, У дажджлівую кастрычніцкую ноч наш партызанскі атрад выйшаў на баявую аперацыю. Да чыгункі трэба было падысці незаўважанымі. Вось і чыгуначнае палатно. Побач – станцыя Талька. Некалькі мінут, і пад рэйку падкладзен зарад узрыўчаткі. Партызаны адышлі ўбок і пачалі чакаць. Неўзабаве ў лясной прагаліне паказаўся чыгуначны састаў. Яркая асляпляльная ўспышка вырвала з цемры паравоз, які быццам стаў на дыбы. Састаў з ваеннай тэхнікай праціўніка пайшоў пад адхон.

– Прыбыў дакладна па графіку,– пажартаваў хтосьці з партызан, былых чыгуначнікаў.

А ў гэты час другая група народных мсціўцаў пад камандаваннем Сцяпана Сумчанкі каля Лапіч узарвала мост праз Свіслач. Неўзабаве яшчэ адзін узрыў скалыхнуў зямлю. Гэта група партызан на чале з Сяргеем Мазурам разбурыла мост каля вёскі Арэшкавічы.

Пасля акупацыі вобласці ў глыбокім тыле праціўніка пачаў разгортвацца масавы партызанакі рух. На смяротную барацьбу з лютым ворагам узняліся людзі розных узростаў і прафесій. Іх аб’ядноўвала адно – бязмежная любоў да сваёй Радзімы і лютая нянавісць да ворага. Мірныя людзі бралі ў рукі зброю, каб адпомсціць фашыстам за іх здзекі.

Атрады народных мсціўцаў няспынна раслі і папаўняліся. Сваімі актыўцымі дзеяннямі народныя мсціўцы скоўвалі даволі значныя сілы гітлераўскіх войск. Партызаны разбуралі камунікацыі праціўніка, пускалі пад адхон чыгуначныя эшалоны, узрывалі масты на чыгунках і шасэйных дарогах. Зямля гарэла пад нагамі гітлераўцаў.

У ліпені 1943 года пачалася гістарычная бітва на Курскай дузе. Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі прыняў пастанбву аб разбурэнні чыгуначных камўнікацый праціўніка. У ноч з 2 на. 3 жніўня больш чым 40 тысяч партызан нашай. вобласці выйшлі на "рэйкавую вайну". Дзесяткі тысяч ўзрываў азарылі зямлю. Наша партызанскае злучэнне ў гэту ноч штурмам авалодала ўчасткам чыгункі Асіповічы – Татарка і вывела яго са о строю. У наступную ноч такая ж аперацыя была праведзена на чыгунцы на ўчастку Асіповічы – Брыцалавічы. Акрамя разбурэння чыгуначнага палатна, наша партызанскае злучэнне на працягу жніўня 1943 года пусціла пад адхон 98 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай праціўніка.

У барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі народныя мсціўцы праяўлялі мужнасць і адвагу. На рахунку камсамольца-падрыўніка Барыса Дзмітрыева 18 пушчаных пад адхон эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, больш чым 20 узарваных мастоў, два падарваныя на мінах танкі і дзесяткі аўтамашын. За мужнасць і гераізм яму прысвоена

званне Героя Савецкага Саюза. Мужна змагалася з ворагам партызанка Рыма Кунько. Смерцю героя загінула ў гестапаўскіх засценках партызанская сувязная камсамолка Ніна Міжэрная.

Ужо даўно адгрымела вайна. Адноўлены разбураныя ворагам гарады і вёскі. Былыя партызаны, якія ў час вайны са зброяй у руках змагаліся з ворагам, заняты мірнай стваральнай працай. Адны з іх водзяць па сталёвых магістралях магутныя паязды, другія вырошчваюаь збажыну, трэція ўзводзяць новыя дамы, Усе яны працуюпь над тым, каб на зямлі быў мір, каб не прыйшлося зноў браць у рукі зброю.

**Каралёў, М. Ішлі ноччу партызаны / М. Каралёў // Звязда. — 1964. — 20 мая. — С. 3.**